Сцяпан Говін,
Беларускі дзяржаўны універсітэт

# Янка Купала: Узыходжанне
(да 125-годдзя з дня нараджэння)

Першым друкаваным мастацкім творам пісьменніка быў беларускамоўны верш «Мужык», змешчаны 15 мая 1905 г. у мінскай прыватнай газеце М. Мысаўскога «Северо-Западный край». А вось першы публіцыстычны твор – падарожныя нататкі «Думкі з пабыцця ў Фінляндыі на Іматры» – пабачыў свет толькі праз пяць гадоў (Наша ніва, 1910, №№ 29, 30). Я. Купала, такім чынам, працягнуў традыцыю амаль усіх больш-менш вядомых беларускіх творцаў XIX – пачатку XX ст., якія разам з літаратурнай працай займаліся і журналістыкай, выступаючы па самых хвалюючых, самых актуальных тэмах палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця народа. Праз публіцыстыку ён імкнуўся давесці да кожнага беларуса спрадвечныя ісціны дабра і зла, чалавечай годнасці, свабоды і роўнасці, суладдзя людзей і цэлых народаў, узаемнай павагі адзін да аднаго.

Журналістыкай Я. Купала пачаў займацца пазней. Сёння, праз дзесяцігоддзі, мы наўрад ці знойдзем вычарпальнае тлумачэнне гэтаму, але на некаторыя моманты яго працяглага «публіцыстычнага маўчання», варта звярнуць увагу. Перш за ўсё на тое, што на пачатку XX ст. у Расіі (адпаведна і на яе ўскраіне – у Паўночна-Заходнім краі) у эканамічным і палітычным жыцці адбываліся працэсы, якія неўзабаве ўскалыхнулі ўсю Еўропу. Яны крыху пазней выліліся ў змену дзяржаўнага ладу. Змены не адбываліся знянацку, да іх трэба было рыхтавацца, у тым ліку і беларускай адраджэнскай інтэлігенцыі, сярод якой быў і Я. Купала. Яму, як і іншым дзеячам беларускай культуры, патрэбен быў час, как асэнсаваць змены, што адбываліся ў жыцці народа. Не спрыяла публіцыстычнай актывізацыі пісьменніка палітычная і культурная экспансія, русіфікацыя, пагардлівыя адносіны ўлад да патрабаванняў народаў нацыянальных ускраін: беларусы не мелі магчымасці ні пісаць, ні выдаваць на роднай мове кнігі, перыядычныя выданні. Толькі пасля Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. яны нарэшце атрымалі адноснае права ствараць свае легальныя газеты і часопісы, выдавецкія суполкі, але іх дзейнасць жорстка кантралявалася і праследавалася мясцовымі ўладамі і цэнзурай.

Першая легальная беларуская газета пачатку XX ст. «Наша доля» (№ 1 выйшаў толькі 1(14) верасня 1906 г.) – была выдадзена амаль праз год пасля падпісання Маніфеста. Беларуская творчая інтэлігенцыя нават не мела патрэбных матэрыяльных сродкаў, каб аплаціць паслугі выдаўцоў. Пра тое, з якой цяжкасцю ўдалося знайсці грошы на выданне першых нумароў «Нашай долі», успамінаў пазней адзін з прадстаўнікоў беларускага адраджэнскага руху Францішак Умястоўскі. У часы выхаду газеты «Наша ніва» Іван

Луцкевіч, які збіраў экспанаты для будучага музея беларускай культуры, найменш каштоўныя з іх вымушаны быў прадаць, а атрыманыя грошы аддаваў рэдакцыі, каб аплаціць выпуск чарговых нумароў газеты.

Я. Купала ў гэты час знаходзіўся ў стане «пошуку сябе». Ён усё бачыў і разумеў і яшчэ павінен быў многа працаваць, часта нават фізічна, каб падтрымаць маці-арандатарку, якая пасля смерці мужа (бацька Я. Купалы памёр у 1902 г.) з'яўлялася адзінай, хто ўтрымліваў вялікую сям'ю.

І ўсё ж таленавіты юнак, далучаны да роднай мовы, ужо не мог быць адарваны ад беларускай культуры, прыгожага пісьменства, тым больш што дзеячы беларускай культуры падтрымлівалі маладога творцу. Гэта былі літаратуразнавец і фалькларыст Б. Эпімах-Шыпіла, яго брат, дзяржслужачы Уладзіслаў, пісьменнік Ядвігін Ш., кнігавыдавец А. Грыневіч, а таксама М. Горкі, крытыкі Я. Янкоўскі (Польшча), А. Чэрны (Чэхія) і інш. Бадай, самы вялікі ўплыў на Я. Купалу зрабіў У. Самойла, які паспрыяў публікацыі верша «Мужык» у газеце «Северо-Западный край», стаў як бы «хросным бацькам» пісьменніка ў літаратуры. Пазней Я. Купала пісаў, што ён з гэтага часу добра ўсвядоміў, што пісаць і пра што пісаць [1, 223].

На пачатку ХХ ст. у беларускую літаратуру і журналістыку прыйшло новае пакаленне майстроў беларускага слова – Я. Колас, М. Багдановіч, М. Гарэцкі, Цётка, А. Луцкевіч, В. Ластоўскі і інш. Талент Я. Купалы заўважыў і падтрымаў Ядвігін Ш., які пасля выхаду ў свет у выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» паэтычнага зборніка «Жалейка» (1908 г.) адным з першых вызначыў гэтую адметнасць, адгукнуўшыся на кнігу станоўчай рэцэнзіяй. Рэцэнзент метафарычна пісаў, што паэт, на яго думку, пры занадта аднастайным жыцці беларусаў знайшоў шматколерныя фарбы, якія дапамаглі пісьменніку паказаць беларуса, а разам і ўвесь беларускі народ, тым народам, які пачынае цягнуцца да гэтай шматколернасці, які ўжо не хоча жыць у шэрасці і абыякавасці.

У публіцыстыцы 1910–1915 гг. Я. Купала распрацоўваў самыя актуальныя тэмы беларускага нацыянальнага адраджэння, духоўнага росту беларусаў, іх імкнення да свабоды і незалежнасці. За час супрацоўніцтва з «Нашай нівай» і працы ў ёй на пасадзе рэдактара Я. Купала надрукаваў больш як 30 матэрыялаў – артыкулаў, карэспандэнцый, аглядаў, рэпартажаў, падарожных нататак і іншых твораў, у якіх узнімаў надзённыя праблемы жыцця беларусаў. Так, у артыкуле «Святкаванне Купалы ў Вільні» ён распрацоўваў тэму роднай Беларусі, яе багатай гістарычнай спадчыны, пераемнасці народных традыцый і звычаяў. Артыкулам «Чаму плача песня наша? (Адказ Юрцы Верашчаку)» публіцыст падтрымаў фактычна першую ў беларускім літаратуразнаўстве дыскусію аб ролі беларускай культуры ў духоўным выхаванні чалавека [2, 48–52]. У палемічным артыкуле «А ўсё ж такі мы

жывём!..» ён даў адказ «заходнерусістам» з «Виленского вестника» (1760–1916 гг.) і «Северо-Западной жизни» (1911–1915 гг.), якія апантана кідаліся на кожнага, хто хоць бы вымаўляў беларускае слова [3].

У гады першай сусветнай вайны Я. Купала ўважліва сачыў за падзеямі на Заходнім і іншых франтах. Пішучы пра вайну, публіцыст з горыччу адзначаў яе недарэчнасць і жудаснасць, яе непатрэбнасць, паказваючы, якое вялікае гора і наступствы яна нясе народам не толькі тых краін, якія ваююць, але і ўсёй Еўропе. Я. Купала прадбачыў, што вайна можа прывесці да нечаканых перамен, і заклікаў беларускі народ не быць абыякавым, а групавацца, каб стаць моцнымі і разам выступіць у барацьбе за свабоду і незалежнасць.

Публіцыстыка Я. Купалы 1910–1915 гг. – трывалая прыступка да яго актыўнай журналісцкай працы ў 1919–1920 гг., часу, калі вырашаўся лёс не толькі беларускай дзяржаўнасці, але існавання беларусаў як нацыі.

1. Купала Я. [Л. М. Клейнборжу]. Мінск. 11.1.1929 г. // Публіцыстыка. Мінск, 1972.
2. Говін С. Роля «нашаніўскай» дыскусіі (1913 г.) у развіцці беларускай літаратуры // Журналістыка – 2001. Мінск, 2001.
3. Наша ніва. 1917. № 24.